ВЕТЭРАН ВАЙНЫ СТВАРЫЎ ПРЫВАТНЫ МУЗЕЙ ВАСІЛЯ БЫКАВА Ў ГРОДНЕ

86-гадовы Мікалай МЕЛЬНІКАЎ разам з іншымі ветэранамі вайны вельмі хоча, каб музей стаў дзяржаўным

Гарадзенцу Мікалаю Мельнікаву 86 гадоў — ён аднагодак народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Удзельнік вайны, кандыдат навук, педагог з 40-гадовым стажам... Здароўе ў Мікалая Аляксандравіча ўжо не вельмі: ходзіць цяжка, гаворыць ціха, хутка стамляецца. Але гэты старэнькі заслужаны чалавек знайшоў у сабе сілы на тое, каб стварыць прыватны музей Васіля Быкава. І цяпер клапоціцца, каб праца не знікла — хоча перадаць свой музей дзяржаве. Таксама выступае з ініцыятывай, каб імя Быкава ўшанавалі ў Гродне — усё ж пісьменнік пражыў тут практычна траціну жыцця!

З Мікалаем Мельнікавым мы сустрэліся ў музеі — пакойчыку на Савецкай, 31, дзе з цяжкасцю змясціўся б двухспальны ложак... Мікалай Аляксандравіч сядзіць на крэсле пасярэдзіне пакоя — і, здаецца, можа не падымаючыся дацягнуцца да любога экспаната: савецкага пашпарта Васіля Быкава, асабістай ручкі, кававаркі пісьменніка...



— Мікалай Аляксандравіч, стварыць прыватны музей — сур'ёзны крок, асабліва ў вашым узросце...

— Такая ідэя ўзнікла ў мяне разам з баявымі таварышамі-ветэранамі пасля таго, як у 2003 годзе мы ездзілі ў Мінск на пахаванне Васіля Быкава. Па дарозе дадому мы прынялі рашэнне стварыць калі не музей, то хаця б куточак — Быкаў жа франтавік, і ў Гродне ён пражыў чвэрць стагоддзя. Аднак удалося назбіраць столькі экспанатаў, што атрымаўся сапраўдны музей, няхай і невялікі па плошчы.

— А які афіцыйны статус мае музей?

— Асобна — ніякага. Мы знаходзімся ў пакоі, які належыць нашай арганізацыі — Гродзенскаму гарадскому аб'яднанню ветэранаў вайны, працы і ўзброеных сілаў. Мы вельмі ўдзячныя Ірыне Міхайлаўне Быкавай, удаве Васіля Уладзіміравіча. Большасць з таго, што тут ёсць, перадала нам яна — найперш гэта асабістыя рэчы пісьменніка. Вялікім гонарам і радасцю для нас, ветэранаў, стваральнікаў музея была падзея, калі на святкаванне 9 мая ў гэтым годзе да нас прыйшло тры пакаленні нашчадкаў Быкава — сын Васіль Васільевіч, унук Яўген і маленькая праўнучка Лада.

— Мікалай Аляксандравіч, а што менавіта натхніла вас на стварэнне музея Васіля Быкава ў Гродне?

— Я лічу, што гэта вялікі пісьменнік, што сваімі творамі ён можа ўздзейнічаць на народ больш, чым нейкія арганізацыі. Сваімі творамі ён паказаў вайну, яе гераізм, мужнасць і барацьбу.

— А вы асабіста былі знаёмыя з Быкавым?

— Добра быў знаёмы. Не тое, каб блізкі быў, але быў знаёмы. Ён бываў у мяне, я рабіў усё, каб яго папулярызаваць. Прыязджалі сюды з Масквы настаўнікі, журналісты — я іх вёў знаёміць з Быкавым, яны пасля пісалі артыкулы, водгукі ў часопісы і газеты.

— Кім вы працавалі?

— Я працаваў у Гродзенскім універсітэце старшым выкладчыкам, пасля загадчыкам кафедры рускай і замежнай літаратуры. Я кандыдат педагагічных навук, дацэнт, маю некалькі сваіх кніг...

— Вы працавалі ва ўніверсітэце, Быкаў у газеце... А як вы тады пазнаёміліся, што вас звязвала?..

— Нас аб'ядноўваў адзін погляд на гісторыю, на вайну. Якая была вайна, чаму яна была такая. Нас звязвала праўда пра Беларусь — пра яе мінулае і сённяшняе. Мужнасць Быкава, ён сам для нас з'яўляўся прыкладам. Ён даў адказ на многія пытанні, звязаныя з гісторыяй, з вайной.

— Якія вы бачыце перспектывы развіцця музея? Якім бы вам хацелася яго бачыць?

— Зараз музей як бы прыватны — належыць ветэранскай арганізацыі. Усё, што мы здабываем, даводзіцца прабіваць сваімі сіламі. Мы хочам, каб музей быў дзяржаўны, каб ён меў больш вартае памяшканне, структуру, методыку — усё, што патрэбна сапраўднаму музею. Трэба сказаць, што ўлады цікавіліся нашым музеем, чыноўнікі бывалі ў нас, ухвалялі... Але пакуль ні да чаго не прыйшлі. Увогуле, я вам скажу, гэта крыўдна і незразумела, што Быкаў пражыў у Гродне столькі гадоў, напісаў тут свае славутыя творы — а яго памяць ніяк не ўшанаваная. Ні нармальнага музея, ні шыльды на доме, ні помніка, ні вуліцы... Дарэчы, Быкаву так і не надалі званне ганаровага грамадзяніна Гродна — лічу, што трэба зрабіць гэта хаця б пасмяротна. Я мяркую, што сёлета — у год 65-й гадавіны Вялікай Перамогі (а Быкаў — салдат той Перамогі!) — трэба ўшанаваць у нашым горадзе яго імя!..

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

Гродна—Мінск

КАМЕНТАР ЧЫНОЎНІКА

«МЫ ПРАПАНОЎВАЕМ МЕЛЬНІКАВУ НЕКАЛЬКІ ВАРЫЯНТАЎ»

Гродзенскія ўлады пра сітуацыю ведаюць. Калі я назваў прозвішча Мельнікаў, то **прэсавы сакратар аблвыканкама Віктар ЖАЛЕЗНЯКОВІЧ** прадэманстраваў, што валодае сітуацыяй.

— Гэтаму пытанню некалькі гадоў, — адказаў Віктар Паўлавіч. — Мы прапаноўвалі спадару Мельнікаву некалькі варыянтаў. Адзін — Музей Максіма Багдановіча. Рэч у тым, што ў тым доме, апроч музея, пражывае тры сям'і. І ў перспектыве мы хочам іх перасяліць, каб музей пашырыць. Але гэта справа не сённяшняга ці заўтрашняга дня, бо сацыяльнага жылля цяпер будуецца мала. Таму мы прапанавалі Мікалаю Аляксандравічу перадаць матэрыялы туды, каб прафесійныя музейшчыкі пачалі ствараць спачатку экспазіцыю, а пасля, магчыма, пашыраліся б і да паўнавартаснага музея. Іншы варыянт — музей «Гродзенскай праўды», які ўжо існуе і дзе таксама ёсць куточак, прысвечаны Васілю Быкаву. Таксама разглядаецца варыянт даць ветэранскай арганізацыі больш за цяперашні пакой, каб яны маглі пашырыць плошчу свайго музея.

— Віктар Паўлавіч, а чаму ў Гродне, дзе Быкаў пражыў траціну жыцця, ягонае імя ніякім чынам пакуль не ўшанавана?

— Я мяркую, што ў перспектыве гэта будзе абавязкова зроблена.

Юрый ПУНТУС:

«У матчы Англія — Германія як балельшчык я на баку англічан. Але як спецыяліст далёкі ад думкі, што Англія пераможа»

Трынаццаты гульнявы дзень мундыяля расставіў па месцах двух еўрапейскіх фаварытаў, якія ўсё ж такі прабіліся ў плэй-оф. Калі ў магчымасцях Германіі завяваць пуцёўку мы амаль не сумняваліся, то зборная «трох львоў» прымусіла пахваляваццa сваіх балельшчыкаў. Тым не менш, Англія таксама ў плэй-оф. Мінімальнай перамогі над Славеніяй (1:0) хапіла для таго, каб заняць другое месца. З першага ў групе С выходзіць каманда ЗША, якая на 91-й хвіліне забіла-такі зборнай Алжыра. Першае месца ў групе D за «бундэсцім» — падапечныя Іахіма Лёва перайгралі 1:0 Гану. Але і афрыканская каманда працягвае выступленні. Але гэта дзякуючы Сербіі, якая бязвольна страціла пуцёўку ў 1/8, саступіўшы 1:2 Аўстраліі. Такім чынам, вызначыліся тры пары 1/8 фіналу: Уругвай — Паўднёвая Карэя (26 чэрвеня, у 17.00 па беларускім часе), ЗША — Гана (26 чэрвеня, 21.30), Аргенціна — Мексіка (27 чэрвеня, 21.30).

Абмеркаваць апошнія падзеі чэмпіянату свету мы папрасілі **галоўнага трэнера брэсцкага «Дынама» Юрыя Пунтуса.**

— Юрый Іосіфавіч, што здарылася з братамі-славянамі — сербамі, якія так нядрэнна гулялі з немцамі і раптам так бясслаўна саступілі прадстаўнікам зялёнага кантынента?

— На мой погляд, зборная Сербіі — моцная каманда, яна гэта і даказала, асабліва ў матчы з Германіяй. Сербы абавязаны былі выходзіць з групы па сваім патэнцыяле. Аднак нечакана для ўсіх і для сябе, у першую чаргу, прайгралі. Здарылася гэта таму, што яны яшчэ да матчу вырашылі, што аўстралійцаў перайгралі. А прапусціўшы два мячы, амаль немагчыма перанастроіцца і даказаць, што ты мацней. Так што ў тым, што сербы едуць дадому, вінаватыя выключна самі.

— Дзякуючы Сербіі і Аўстраліі Гана стала адзіным прадстаўніком Афрыкі ў плэй-оф. Але на старце ад камандаў чорнага кантынента чакалі большага, спадзяваліся, што з'явіцца каманда, пра якую ўсе загавораць...

— І сапраўды, чакалі большага ад іх. Але футбол у Афрыцы развіваецца. І дзякуючы еўрапейскім трэнерам ён прыходзіць у норму арганізацыйнага плана, дадае ў такіх кампанентах, як вядзенне гульні, тактычныя задумы. А іх тэхнічная аснашчанасць, фізічная падрыхтаванасць — гэта заўсёды ў афрыканскіх футбалістаў на ўзроўні. Так, гэта нечакана, што толькі Гана, і то дзякуючы збегу абставін, выйшла з групы. Асабіста я разлічваў і на каманду гаспадароў турніру.

— Ці прагматычна падышлі да гульні немцы? Маглі ж прапусціць на апошніх хвілінах ад Ганы, зрабіўшы нічыю, і тым самым выходзіць з групы на другім месцы, трапляючы ў 1/8 не на Англію, а на ЗША...

— Я супраць такога прагматызму. Гэта падмануць сябе і футбол. Такія рэчы футбол потым не прабачае. Яны правільна зрабілі, што гулялі на перамогу і дасягнулі яе.

— Што ўвогуле мы можам казаць пра зборную Германіі, якая разграміла Аўстралію, прайграла Сербіі, мінімальна перамагла Гану?

— Адказ на гэта пытанне мы атрымаем пасля гульні з Англіяй. Я сёння сімпатызую нямецкай камандзе і яе гульні. Лёў пастараўся зрабіць для балельшчыкаў відовішча. Раней футбол зборнай Германіі — гэта татальная дысцыпліна плюс фізічныя кандыцыі, нямецкі напор. Сёння яны дэманструюць футбол, які любяць гледачы. Вядома, яны не настолькі дасканалыя, каб усіх грамiць, але гульня вельмі прыстойная. У матчы Германія — Англія як балельшчык буду хварэць за англічан, бо даўно перажываю за гэту зборную. Але як спецыяліст я далёкі ад думкі, што Англія абавязкова выйдзе пераможцам у гэтай пары.

— Пачынальнікі футбола на сёлетнім мундыялі мелі ўсе шанцы абняславіцца не горш за французаў. Але яны выціснулі з сябе перамогу над Славеніяй 1:0. Што адбываецца з камандай? Ужо ўвесь свет смяецца з англійскіх варатароў, кожны з якіх здольны пусціць «плюху», але ці толькі ў іх справа?

— Я не згодны з тым, што перамога над Славеніяй была вымучаная. Англія паклала суперніка на лапаткі. Адзінае, што яна не зрабіла, — не рэалізавала моманты. Працэнт рэалізацыі слабенькі, лік 1:0, што і дае падставу тым, хто не глядзеў гульню, меркаваць, што перамога вымучаная. Што адбываецца з варатарамі, цяжка сказаць. Ва ўсіх бываюць чорныя палосы, гэта збег абставінаў, а не слабасць англійскіх варатароў. Што тычыцца гульні, згодны, што яны самі паставілі сябе ў такую сітуацыю, што ад апошняй гульні залежаў лёс. Але ў такой сітуацыі яны і праявілі сілу. Я ўпэўнены, што і з немцамі, і ў выпадку, калі немцы будуць абгуляныя, мы ўбачым зусім іншых англічан. Футбалісты падышлі да чэмпіянату выпустанымі — у Англіі такое першынство, якое аднімае ўсе эмоцыі і сілы. Гэта бачна на прыкладзе таго ж Руні. А перад турнірам Фабіа Капэла паставіў іх у жорсткія рамкі трэніровачнага працэсу, як ён гэта ўмее. І тут або крыху спазніліся «адпусціць», або не ўгадалі з часам. А магчыма, так і задумана — усе сілы для плэй-оф. Таму і такі невыразны футбол у двух першых матчах.

— Мы гаварылі пра тое, што Германіі лепш было б сустрэцца ў 1/8 з ЗША, але ці лягчэй было б гуляць з сённяшняй зборнай Злучаных Штатаў? Каманда выклікае сімпатыі і сваёй гульнёй, і воляй да перамогі, і тым, што насуперак яўным судзейскім памылкам не на яе карысць выйшла ў плэй-оф...

— Амерыка выйшла ў 1/8 вельмі заслужана — гульня дастойная. Пытанне, з кім лягчэй — Англіяй ці ЗША — філасофскае. Адназначна сказаць, што Германія перайграла б у 1/8 ЗША ніяк нельга.

— Якія зборныя здзівілі на турніры і чыя гульня, наадварот, расчаравала?

— Парадавалі Аргенціна і Галандыя. Зразумела, што расчаравала Францыя і афрыканскія каманды — ад іх чакалі большага.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ЧЭМПІЁНЫ СВЕТУ СКЛАЛІ ПАЎНАМОЦТВЫ

Каманда Італіі ў драматычным матчы прайграла зборнай Славакіі — 2:3 і заняла апошняе месца ў групе F. Зборныя Парагвая і Новай Зеландыі згулялі ўнічыю 0:0. У 1/8 фіналу прайшлі каманды Парагвая і Славакіі.

СПАЖЫЎЦЫ ІДУЦЬ НА МІРАВУЮ

Па статыстыцы Вярхоўнага Суда трэцяя частка ўсіх іскаў па парушэннях правоў спажыўца заканчваецца міравым пагадненнем.

Свае новыя туфлі жыхарка сталіцы купіла за 260 тыс. Панасіўшы месяц, жанчына здала іх у рамонт, каб паставіць набойкі ды падклеіць насы. Аднак пасля першай жа носкі набойка на левай назе стала круціцца. Жанчына ўважліва агледзела туфлі і ў дадатак заўважыла трэшчыны на абцасах, якія былі акуратна замазаны фарбай. Пасля экспертызы яна паспрабавала патрабаваць кампенсацыі ў майстэрні, аднак адказу не атрымала. У судзе дырэктар майстэрні падпісаў міравое пагадненне па аплаце кошту абутку, дапамогі прадстаўніка грамадскай арганізацыі, правядзення экспертызы, а таксама штрафу. Усяго каля 870 тыс. рублёў.

Бабуля заключыла дамову на выраб і ўстаноўку надмагільнага гранітнага помніка з агароджай. Па дамове яна заплаціла 400 долараў з 1300. Аднак помніка так і не дачакалася. Бабуля з абурэннямі прыйшла да прадпрымальніка. У адказ ёй вярнулі яе грошы. Аднак няўстойку плаціць не захацелі. У судзе прадпрымальнік пагадзіўся на кампенсацыю няўстойкі і маральнага ўрону ў памеры 2 млн рублёў.

Міравое пагадненне было падпісана таксама падчас спрэчкі з адным са сталічных ЖЭУ. Пасля патопу ў кватэры аднаго мінчаніна стала зразумела. што не суседзі тут прычына. Экспертная камісія высветліла, што «вінаватая» труба з халоднай вадой, якая раптоўна прарвалася. Камісія прыйшла да высновы, што рамонт у паўтара мільёна рублёў павінна кампенсаваць ЖЭУ. Таму што менавіта яны сочаць за станам камунікацый. У судзе прадстаўнікі ЖЭУ і жыхары падпісалі міравое пагадненне. Згодна яму, акрамя штрафу, упраўленне заплаціла няўстойку, маральны ўрон і выдаткі, звязаныя з абаронай правоў спажыўца.

— Колькасць судовых спраў па парушэннях правоў спажыўцоў летась павялічылася больш чым у два разы ў параўнанні з 2005, — кажа **намеснік старшыні Вярхоўнага Суда Беларусі Андрэй ЗАБАРА.** — Часцей за ўсё ў суды звяртаюцца па справах нядобрасумленных прадаўцоў, няякаснага тавару, няякасна выкананых работ, звароту сумы панесеных выдаткаў, а таксама па дамовах куплі-продажу, дамовах падраду. Актыўна пайшлі скаргі таксама і на парушэнні правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг. Больш за ўсё людзі скардзяцца на якасць выкананых рамонтных работ, прыборкі дваровых тэрыторый і г.д. Больш за палову (67 %) іскаў задавальняецца судамі. Фактычна кожны трэці спажывец падпісвае міравое пагадненне.

За мінулы год колькасць міравых пагадненняў склала больш за тысячу. Як паведамілі ў ГА «Мінскае таварыства абароны спажыўцоў», асноўная прычына падпісання міравога пагаднення ў тым, што толькі прыходзячы ў суд адказчыкі разумеюць усю сур'ёзнасць сітуацыі.

— У нас вельмі шмат падпісваецца міравых пагадненняў. Каля 90 працэнтаў, — расказалі ў «Мінскім таварыстве спажыўцоў». — А чаму? Таму што часта толькі такім чынам можна прыцягнуць да адказнасці.

Настасся ЗАНЬКО.

ЛІДАРЫ ГУБЛЯЮЦЬ АЧКІ

У матчах 16-га тура фаварыты чэмпіянату Беларусі не здолелі атрымаць перамогі. Лідар першынства барысаўскі БАТЭ ў сябе дома ўнічыю згуляў з наваполацкім «Нафтанам» — 1:1. На 11-й хвіліне вылучыўся Віталь Радзівонаў, а затым на 46-й хвіліне гол у свае вароты забіў абаронца БАТЭ Сяргей Сасноўскі. Мінскае «Дынама», якое займае другое месца, не здолела перамагчы сталічны «Партызан» — 0:0. «Мінск» разграміў 4:0 жодзінскае «Тарпеда» і выйшаў на трэцяе месца. Вось астатнія вынікі: «Шахцёр» (Салігорск) — «Белшына» (Бабруйск) — 1:1, «Днепр» (Магілёў) — «Віцебск» — 0:0, «Дынама» (Брэст) — «Нёман» — 4:0.

Турнірнае становішча: БАТЭ — 35 ачкоў, «Дынама» (Мінск) — 33, «Мінск» — 30, «Белшына» — 28, «Шахцёр» — 28, «Дынама» (Брэст) — 23, «Днепр» — 22, «Віцебск» — 15, «Нафтан» — 14, «Нёман» — 11, «Тарпеда» — 9, «Партызан» — 9.

Матчы наступнага тура адбудуцца 27 чэрвеня, у нядзелю.

Алена КРАВЕЦ.

Этнаскарбонка

Што хавае беларуская міфалогія?

(Пачатак гутаркі з даследчыкам Ігарам Вуглікам у нумары за 23 чэрвеня.)

Традыцыйная паганская міфалогія — рэч вельмі ўстойлівая, бо забяспечвае сувязь чалавека з блізкім бытавым асяроддзем. На Беларусі яшчэ і сёння могуць пераносіць дамавікоў з адной хаты ў іншую, верацъ у іх, альбо прыбягаюць да дапамогі ката, які будзе ганяць злых прывідаў, ці вераць у душы продкаў, хоць за савецкім часам міфалагічнае мысленне ў нашай краіне шмат у чым змянілася. Наогул, доўгі час лічылася, што міфалогіі беларусаў не існуе. А дарэмна. Бо любы народ стварае міфалогію, зыходзячы са свайго менталітэту. І, каб не згубіць сваю адметнасць сярод іншых насельнікаў свету, усё ж не пашкодзіла б ведаць, якім нашы продкі ўяўлялі свет.

Так, адна з беларускіх адметнасцяў у тым, што нашы персанажы прыземленыя. У нас няма свайго Алімпа, дзе далёка сядзяць багі. Нашы хрысціянскія і паганскія галоўныя персанажы ходзяць па зямлі. Іх можна пабачыць у полі, на ўскрайку вёскі, яны заходзяць у хаты. Нават цяжка сказаць, хто з багоў у нас жыў на небе, акрамя Перуна, Чарнабога, Сонца. Фактычна нашы багі — носьбіты этычных ідэй, сярод якіх на першым месцы працавітасць, паважлівае стаўленне да іншых. У нашых багоў няма ўлюбёнцаў, як, напрыклад, у Грэцыі, дзе Афіна дапамагала Адысею, Гера — Ясону ў значнай ступені па ўласных прыхільнасцях. У нас усё дакладна, нават нячысцікі не караюць людзей проста так. Чалавек ведаў, што яму трэба сябе прыстойна паводзіць, каб не было праблем з дабрабытам, здароўем.

Нашы багі не агрэсіўныя, не экстрэмісцкія. У нас няма бога вайны. Ваяўнічае боства ва ўсходніх славян — Пярун — забівае нячысцікаў. У беларусаў таксама агрэсіўна злы Чарнабог (персанаж цьмяны, магчыма, літаратурны), які насылае чорныя хмары. Але ў нашай краіне існуе шмат паданняў пра войны, міфалагізацыя іх герояў, прычым беларускія міфы і іх дзейныя асобы вылучаюцца сваёй гістарычнай дакладнасцю.

— Наўрад ці ў нас магчымы фенамен Раланда, калі не надта заўважны пры жыцці, адзін са шматлікіх воінаў, становіцца ўзорам еўрапейскага рыцарства. У нашых міфах адлюстроўваюцца рэальныя героі — Вітаўт, Сцяпан Батура, якія падаюцца ў адпаведнасці з іх гістарычнай роляй, — заўважае Ігар Вуглік.

У Беларусі захаваліся «кавалкі» цікавай светапогляднай сістэмы, напрыклад, што душа адна ў чалавека, голуба, пчалы.

— Гэта рэальна адзін крок да тэорыі рэінкарнацыі, індывідуальнага колазвароту, — гаворыць даследчык. — У большасці народаў у міфалагічным менталітэце існавала ідэя цыклізму. Кожным цыклам кіруюць багі, якія паміраюць і нараджаюцца, як Ярыла. Усё круціцца да бясконцасці, канца свету няма. Хаця ў нас быў і міф пра калодзеж з трыма днішчамі — калі трэцяе правнецца, будзе канец свету. Паганская міфалогія была даволі аптымістычнай, сістэма была заземленая і прагматычна-рэалістычная, калі ўсё грунтавалася на ідэях бесперапыннага шляху жыцця, сувязі з продкамі і нашчадкамі, адвечнай памяці, людзі не рабілі асноўны акцэнт на выратаванне ўласнай душы, а дбалі пра дабрабыт матэрыяльны, які забяспечваў ім добрае існаванне на гэтым і тым свеце.

Народная свядомасць у нас адмаўляла ідэю пекла. Душы ўсіх памерлых жывуць на небе і прыходзяць адтуль у выглядзе дзядоў. Прычым у душ ёсць полаўзроставая дыферэнцыяцыя — вялікія дзяды да нас прыходзяць праз дзверы, а малыя — праз вокны. Ёсць прыгожае беларускае паданне, што, калі чалавек памірае, на небе нараджаецца новая зорка. Ёсць народныя апокрыфы, якія распавядаюць, што пасля смерці душы ідуць да продкаў на неба, а потым усе душы вернуцца ў рай.

У адрозненне ад Еўропы, дзе хрысціянства і паганства дакладна размяжоўвалася, на нашых землях адбыўся іх сімбіёз. Хрысціянскія персанажы ўзялі функцыі паганскіх багоў. Але і паганскі пласт, асабліва гэта тычыцца нячысцікаў, у нас добра захаваўся.

— Ігар Рыгоравіч, а чаму з'явіліся нячысцікі?

— У сусветнай міфалогіі, рэлігіі, за выключэннем індыйскіх асураў, зло — гэта сапсаванае дабро. У беларусаў прынятая хрысціянская канцэпцыя зла, калі Сатана і яго паплечнікі — паўшыя анёлы. Але нячысцікі ў нас у большасці паганскія, іх спецыфіка ў тым, што яны не псуюць душу. Беларускія нячысцікі псуюць вонкавую, фізічную прыроду, напрыклад, могуць зламаць руку, нагу, папсаваць здароўе. Яны рэальныя носьбіты хваробаў і смерці, як напрыклад, Мара, Хвароба, Трасца. Нават прыкладаў пра продаж душы чорту ў нас мала. Чэрці ў нас не фатальныя монстры, а істоты з пачуццём гумару.

— З казак мы ў асноўным ведаем пра Бабу Ягу ды Кашчэя. Ці сустракаюцца гэтыя персанажы ў беларускай міфалогіі?

— Кашчэй — гэта наогул рэдкі для нас персанаж, гэтак жа як і Іван-дурань. У нашых міфах Баба Яга іншая, чым у рускіх, яна жыве ў гушчары лесу, кіруе вядзьмаркамі, ёй носяць душы людзей, хаткі на курыных ножках у нас няма. І кікімара ў нас жыве ў хаце, а ў суседзяў — на балоце. Наогул беларускія казкі досыць спецыфічныя, самыя цікавыя — чарадзейныя, а сярод чарадзейных — гераічныя, бо хутчэй за ўсё раней гэта былі міфы. Вельмі распаўсюджаны ў нас сюжэт пра тое, як герой забівае цмока — тыповы для індаеўрапейскай міфалогіі. Калі міфы сыходзяць, у іх перастаюць верыць і яны ператвараюцца ў казку. Былыя боствы могуць паступова ператварацца ў нечысць. Тая ж Баба Яга — хутчэй за ўсё былая багіня плоднасці — у рускіх казках яна апісваецца, як жанчына з вялікімі грудзямі. Увогуле беларуская міфалогія — арыгінальная сістэма з усімі міфалагічнымі структурнымі кампанентамі. У нас ёсць асноўныя элементы міфалагічнага мыслення, заснаванага на магіі, уяўленнях пра час, прастору, анімізм, татэізм, фетышызм, культ продкаў. Наша міфалогія мае сваю касмагонію, уяўленні пра структуру космасу, прынцыпы яго арганізацыі, сімвалы. Яе адрознівае наяўнасць спецыфічных багоў, якія маюць іерархію. Беларуская міфалогія мае істотную паганскую і хрысціянскую дэманалогію, персанажы якой дзеляцца на нячысцікаў вышэйшых і ніжэйшых, культурнай, маргінальнай, прыроднай прастор, нячысцікаў-паўсюднікаў.

НЯХАЙ ДРАКУЛА АДПАЧЫВАЕ

— Як вы ставіцеся да таго, што зараз аб'явіўся Зюзя Пазерскі, ці трэба так рабіць?

— Гэта трэба было даўно ўжо зрабіць, прычым варта «раскручваць» сваіх персанажаў і ў поп-культуры. Што бракуе беларускай міфалогіі — гэта адсутнасць сюжэтаў. Менавіта таму, што грэчаская міфалогія была багатая сюжэтамі, яна такая папулярная. Але тое-сёе можна стварыць (як у эпасе «Калявала»). Думаю, і беларусам гэтым трэба заняцца, каб увесці міфалогію ў літаратуру і мастацтва. Бо міфалагічныя вобразы архетыпічныя (гэта ўстойлівыя матывы, якія праяўляюцца ў розных формах у розныя эпохі), звязаны з падсвядомым этнасу. Людзі атаясамліваюць сябе з імі, імкнуцца быць на іх падобнымі. Калі гэтага няма, у культурную прастору наносіцца ўсяго з розных канцоў, што руйнуе ментальнасць. Мы захапляемся прывабнымі замежнымі кіношнымі вобразамі, а ў нас дзясяткі некранутых сваіх персанажаў.

— І каго можна так раскруціць, каб завабліваць турыстаў, як на таго ж Дракулу?

— У нас шмат агульнага з еўрапейскімі ўяўленнямі пра вампіраў. Толькі наш аналаг — вупыр — не такі крыважэрны. Распавядалі, што ён не абавязкова прыходзіў смактаць кроў. Напрыклад, гэта муж-нябожчык заходзіў уначы да жонкі, жыў з ёй, а потым сыходзіў (выдатная сюжэтная канва). У нас не было такіх гісторый як, напрыклад, у Расіі, дзе расказвалі пра праклятыя вёскі, пакусаныя вупырам (людзі, якіх укусілі, становяцца вупырамі). А змагаліся ў Беларусі з гэтымі істотамі ўсё тымі ж класічнымі спосабамі: лавілі іх на святло (хавалі за заслону запаленую свечку, калі заслону ўначы рэзка прыняць, вупыр становіцца бачны, і яго трэба адлупцаваць асінавым паленам), забівалі ў іх мёртвае цела асінавы кол.

Наша праблема — адсутнасць эпасу, эпічных герояў. Чуў пра спробы зрабіць аднаго такога героя — Машэку. Але які з яго герой? Гэта бандыт ці істота, якая жыла ў пячоры. З рэальных гістарычных персанажаў у нас найперш увагі заслугоўвае князь Вітаўт. Прычым ён трапіў у фальклор: перад смерцю ён нібыта сказаў, што калі людзям дрэнна, яны павінны яго паклікаць, і ён паўстане і прыйдзе на дапамогу (яго смерць — сон, падобна на стан караля Артура). Неяк людзі вырашылі праверыць і дарэмна паклікалі Вітаўта, чым угнявілі яго. Шмат у Беларусі жаночых персанажаў, з якімі звязана каханне і смерць. Гэта трагічныя вобразы, пачынаючы з Ефрасінні Полацкай, Рагнеды, Барбары Радзівіл і шматлікіх радзівілаўскіх князёўнаў. А колькі ў нас у легендах шэкспіраўскіх сюжэтаў! Напрыклад, ёсць паданне пра князёўну Дрыву, якое звязана з беларускай поўначчу, дзе распавядаецца пра трох братоў, што яе кахалі. І тая, каб абраць сабе жаніха, паставіла ўмову, каб браты пабіліся паміж сабой насмерць. Любы ёй застаўся жывы, але адмовіў Дрыве, пасля чаго яна ўтапілася.

Перспектыўныя для мастацкага асваення нашы казачныя героі: Іван Кабылін сын, Каці-гарошак, Івашка Мядзвежае вушка, Кірыла Кажамяка. Сярод трагічна-змрочных постацяў магчыма вылучыць Бутрыма Няміру, які зрабіў струны скрыпкі з вантробаў маладога Стаўры, да якога мела прыхільнасць яго жонка; князя Алелькавіча Слуцкага, чый замак з выспай знік пад вадой; Оштарпа з Дукоры, які замураваў за замах на сябе дзяўчыну ў нішу сцяны; некаторых Радзівілаў.

Нават ёсць паданні накшталт Папялушкі: пра брата, які кахае сваю сястру, якая бяжыць ад яго на той свет, дзе ён знаходзіць яе па чаравічку. У нас шмат папулярных у міфах інцэстуальных сюжэтаў. Напрыклад, як маці з дачкой сустракаюць сваіх кінутых дзяцей, братоў і прапаноўваюць жыць разам...

Ігар Вуглік упэўнены, што на Беларусі можна назбіраць касавых сюжэтаў на любую аўдыторыю. Прычым гэта могуць быць як станоўчыя выхаваўчыя персанажы, так і прынады на аматараў, якія любяць навarочаныя сюжэты і жахлівчыкі. І навошта нам гэтыя вампіры, дракулы? Калі ёсць такі попыт на монстраў, дык іх і ў Беларусі хапае.

Многае з таго, што мы зараз пераймаем з іншых краін, існавала на нашых землях, толькі пад іншымі назвамі і з мясцовым каларытам.

У нас ёсць і гномы (гарцукі), андрагіны (Купала, Лада), багі тыпа Дыяніса (Ярыла, Купала), асілкі, кентаўры (злы Кумяльган і добры Вазіла).

Наша дэманалогія багатая на каларытныя жаночыя вобразы. Цікавы такі персанаж, як лойма — жанчына, якая ператвараецца ў вялізную жабу, пужае людзей. Часам — гэта прыгожая аголеная дзяўчына, якая чапляецца да адзінокіх мужчын у лесе, але, як толькі завядзе, распаліць да кахання, выслізгвае з абдымкаў і знікае. Лявады, лічылася, можна сустрэць бяскрыўдную расамаху — голую жанчыну з распушчанымі валасамі, якае трымае на руках немаўля (па павер'ях гэта жанчына, якая забіла сваё дзіця і сама ўтапілася). А з зачараванай жанчынай людзі лётаюць і бачаць розныя краіны.

У нас вялікая колькасць паданняў пра русалак — адны з іх бавяць час у лесе і любяць гушкацца на галінках, другія бадзяюцца па няжатых палях, трэція (азёрніцы) жывуць у вадзе. У беларусаў русалка — маладая прыгожая дзяўчына з доўгімі валасамі зялёнага, чорнага, русага колеру. Вочы ў яе халодныя, скура празрыстая. Беларуская русалка абавязкова з нагамі, з хвастамі толькі азёрніцы. У нас ёсць мужчыны-русалкі, ёсць кампаніі жудасных старых русалак. Русалкі жывуць з вадзянікам, але ён вельмі брыдкі (з вялізным жыватом, тонкімі нагамі з перапончатымі пальцамі), таму і шукаюць русалкі сабе мужоў — чапляюцца да мужчын і казычуць іх да смерці. Супраць іх толькі адзін сродак — наставіць іголку, шпільку ім у вочы. Досыць перспектыўныя для апрацоўкі ў масавай культуры нашы татэмістычныя персанажы — вуж, які ператвараецца ў хлопца, жыве з жонкай, мае дзяцей; мядзведзь, які таксама, згодна казцы, жыве з жанчынай і мае нашчадка-героя. Асобна трэба адзначыць ці не найбольш папулярнага ў міфах ваўкалака. Падаецца, што цікавасць для пісьменнікаў могуць уяўляць ваўкалакі, ператвораныя ў ваўка ведзьмаком (асабліва вясельны поезд). Увогуле любоўныя, шлюбныя ўзаемадачыненні міфічных персанажаў і людзей — плённы абшар для мастацкіх апрацовак.

Яшчэ адна асаблівасць беларускай міфалогіі ў тым, што ўсе гэтыя персанажы, нават нячысцікі, падобныя на людзей. Чым далей пэўная істота сялілася ад жытла чалавека, тым больш яна прырода-морфная. Таму самыя пачварныя — балотнік, багнік і аржавеннік — жывуць у балотах. Можа, з-за свайго страшнага выгляду яны і не маюць жаночай пары.

Нават у лесуна ёсць жонка, з якой ён крадзе ў людзей немаўлят і выхоўвае іх, у той час як сваіх уласных дзяцей яны праганяюць.

У паганскай міфалогіі можна назбіраць персанажаў на ўсе выпадкі жыцця. І нават вызначыць сярод іх галоўных. Напэўна, сярод станоўчых персанажаў адным з галоўных мог бы быць Бялун, бацька Перуна. Праўда, гэты дзядзька крыху сабе на розуме — ходзіць босы і просіць добрага чалавека ўцерці яму нос, а пасля пачынае смаркацца золатам. На Беларусі пра багатых казалі, што яны з Белуном пасябравалі. А сярод адмоўных персанажаў на ролю галоўнага можа прэтэндаваць Кадук, што сядзіць у балоце, яму служыць нечысць, носіць маленькіх дзяцей, якіх ён з'ядае, каб перапыніць род чалавечы...

Адным з галоўных абаронцаў роду ад нячысцікаў у часы паганства быў Чур. Сярод арыгінальных беларускіх бостваў, якія звязаны з сямейнай абраднасцю — бог шлюбу Любмел, апякунка дзяўчат Дзявоя, з якой развіваюцца напярэдадні вяселля. А што за дом без хатніка? Народная фантазія добра папрацавала над яго характарам і звычкамі. Хатнік не любіць масак, люстэрка, смеху, сварак, п'янак, бруду ў доме, яго вызначаюць характэрныя ўзаемадачыненні з членамі сям'і...

На жаль, пакуль мы не ўсведамляем, якое гэта багацце і як ім карыстацца. А падаваць нашу міфалогію можна «пад рознымі соусамі». Гэта можа быць як проста смачны аўтэнтычны пачастунак для замежных турыстаў, які аздобіць знаходжанне ў нашых сядзібах і базах адпачынку, альбо выбуховы кактэйль з новых вобразаў і сюжэтаў, які можна прынесці ў літаратуру, мультыплікацыю, фантастычныя фільмы.

— Раскрутка такіх персанажаў — прыбытковая рэч. Нам бы свайго пісьменніка накшталт Толкіена, які апрацаваў кельцкі фальклор, і можна ствараць творы такія ж цікавыя і папулярныя, — заўважае Ігар Вуглік. — Краін, дзе захавалася старажытная міфалогія, вельмі мала, у Еўропе гэты пласт культуры вынішчаны яшчэ 200—300 гадоў таму. Гэта істотная этнакультурная экзотыка.

Калі яшчэ гадоў 20 таму кнігі па міфалогіі беларусаў не выпускаліся, дык сёння з'явілася навукова-папулярная і вучэбная літаратура, сярод якіх і кнігі Ігара Вугліка («Міфалогія беларусаў», «Асновы міфалогіі. Курс лекцый» у дзвюх частках).

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ТЭЛЕФОННЫЯ РАЗМОВЫ ЎНУТРЫ БЕЛАРУСІ ДЛЯ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ВАВ З ЛІПЕНЯ БУДУЦЬ БЯСПЛАТНЫМІ

РУП «Белтэлекам» да Дня Незалежнасці прадаставіць удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны бясплатныя тэлефонныя размовы ўнутры Беларусі. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе прадпрыемства.

Акцыя пачнецца 2 ліпеня апоўначы і працягнецца да 24 гадзін 3 ліпеня. Акцыя не распаўсюджваецца на тэлефонныя размовы з абанентамі мабільнай сувязі, пры доступе ў інтэрнэт і карыстанні платнымі даведачна-інфармацыйнымі службамі. Дадатковую інфармацыю аб акцыі можна даведацца па тэлефоне 153 (даведка бясплатная).

Як нас дураць

ДАБРАДЗЕЙ «АДОРВАЎ» ПРАВАМІ

20-гадовы мінчанін за грошы абяцаў вырашыць пытанне аб атрыманні вадзіцельскага пасведчання.

Для таго, каб стаць уладальнікам правоў, запэўніваў прайдзісвет, не трэба было ні ў аўташколе вучыцца, ні потым здаваць экзамены. Толькі тут, паводле звестак прэс-сакратара ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце Аляксандра Марчанкі, падазроны крывіў душой, бо, прапануючы на такіх мовах атрымаць вадзіцельскае пасведчанне свайму 22-гадоваму кліенту, ён загадзя ведаў, што падмане апошняга. Абяцанні свае хітрун выконваць не збіраўся, а вось грошы, «ахвяраваныя» на гэтую справу прасцяком (300 долараў ЗША), ён забраў сабе. Таксама ахвярай гэтага махляра стаў 27-гадовы сталічны жыхар, якому падазроны паабяцаў за 250 долараў ЗША вырашыць пытанне аб вяртанні канфіскаванага вадзіцельскага пасведчання. І ў гэтым выпадку грошы, узятыя на «высакародную» справу, якой прайдзісвет і не меў намеру займацца, аселі ў яго кішэні. Падазроны затрыманы і змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

Ігар ГРЫШЫН.

НЕЛЕГАЛЬНЫ ЦЭМЕНТ

Нелегальная схема па рэалізацыі беларускага цэменту выяўлена работнікамі ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Магілёўскай вобласці.

Так, у ходзе правядзення сумесных з Крычаўскім МКДК і Крычаўскім РАУС спецыяльных мерапрыемстваў па кантролі за нелегальным абаротам тавараў у Крычаве былі затрыманы два грузавыя аўтамабілі «КамАЗ» і «Фрыдлайнер», што належалі грамадзянам Расійскай Федэрацыі, якія перавозілі цэмент вытворчасці ВРУП «Крычаўцэментшыфер» у колькасці 50 тон (расфасаваны ў мяшкі па 50 кг) на агульную суму 2700 еўра (10,5 млн рублёў).

Кіроўцамі фур былі прад'яўлены суправаджальныя дакументы, згодна з якімі груз перавозіўся з Крычава ў г. Ярцава Смаленскай вобласці на адрас індывідуальнага прадпрымальніка. Пры садзейнічанні расійскіх праваахоўных органаў работнікамі фінансавай міліцыі высветлена, што атрымальнік грузу ў якасці суб'екта гаспадарання на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі не зарэгістраваны і аўтатранспарт для яго перавозкі не замаўляў.

Плата за набыты цэмент была ажыццёўлена за наяўны разлік праз касу філіяла аднаго з банкаў г. Крычава па кошце завода-вытворцы, вызначанай для фірмаў-экспарцёраў. Пры гэтым кошт цэменту, прызначанага для вывазу за межы Беларусі, ніжэйшы за адпускны кошт для рэалізацыі на ўнутраным рынку.

Ёсць падставы меркаваць, што набыты па гэтай схеме цэмент з рэспублікі не вывозіўся, а за наяўны разлік прадаваўся па двайным кошце на рынках вобласці.

Нелегальны груз у перавозчыка быў апісаны і канфіскаваны. Разглядаецца пытанне аб яго перадачы ў даход дзяржавы.

Аляксандр ШАРОЙКІН,
начальнік арганізацыйна-інспектарскага аддзела ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці.